№№127–128
(3053–3054)

18–20 жніўня 2009 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Да 24 жніўня ў паштовых аддзяленнях прымаецца падпіска на «Народную Волю» на верасень і наступныя месяцы.

Іх лёс хвалюе Беларусь!

Юрый Захаранка
знік 3680 дзён таму

Віктар Ганчар
знік 3551 дзень таму

Анатоль Красоўскі
знік 3551 дзень таму

Дзмітрый Завадскі
знік 3264 дні таму

ГУЧНЫЯ СПРАВЫ

Гары ПАГАНЯЙЛА:

«Справы аб знікненні беларускіх палітыкаў раскрыты на юрыдычным узроўні...»

Учора сваякі зніклых беларускіх палітыкаў і незалежныя юрысты, якія працуюць па гэтых справах, склікалі спецыяльную прэс-канферэнцыю. Справа ў тым, што сёлета — своеасаблівы "юбілей ганьбы" беларускай праваахоўнай сістэмы: дзесяць год, як у краіне зніклі вядомыя людзі, але злачынствы так і не раскрыты.

Увесь гэты час сваякі зніклых апанентаў Аляксандра Лукашэнкі марна дабіваліся аб'ектыўнага расследавання гэтых злачынстваў. Па вялікім рахунку ўлады не зрабілі нічога для таго, каб праўда аб іх стала вядомая шырокай грамадскасці. Хутчэй наадварот, паводзіны ўлады ў гэтых выпадках можна ахарактарызаваць як няўмелае замятанне следаў і замоўчванне відавочнага...

Афіцыйны прадстаўнік сем'яў зніклых правазаборца **Гары Паганяйла** лічыць, што ўладам выгадна замоўчаць праўду аб знікненнях, паколькі да іх могуць мець дачыненне вышэйшыя службовыя асобы Беларусі. *"На сённяшні дзень тэрмін расследавання спраў аб забойствах Віктара Ганчара, Юрыя Захаранкі і Анатоля Красоўскага працягнуты, — гаворыць Гары Пятровіч. — Але па выніках расследавання канкрэтных звестак аб лёсах гэтых людзей мы не маем. Не мае гэтых вынікаў і следства. Здавалася б, знікненне экс-міністра МУС Юрыя Захаранкі, чалавека, які валодаў канфідэнцыяльнай інфармацыяй па многіх праблемах, павінна было б прымусіць улады да хутчэйшага расследавання гэтай справы. Аднак крымінальная справа па факце знікнення Юрыя Захаранкі была ўзбуджана толькі пасля знікненняў Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага... Але за гэты час першапачатковыя сляды, магчымасці даказвання па справе былі страчаны. Дзяржава праявіла поўнае нежаданне да расследаванняў гэтых спраў, тым самым ускосна пацвердзіўшы праўдзівасць галоўнай версіі па справах зніклых: да гэтых злачынстваў маюць дачыненне вышэйшыя службовыя асобы Беларусі (нагадаем, беларуская і міжнародная дэмакратычная грамадскасць падазрае ў дачыненні да гэтых злачынстваў экс-камандзіра вайсковай часці 3214 **Дзмітрыя Паўлічэнку,** экс-генеральнага пракурора **Віктара Шэймана,** экс-міністраў МУС **Уладзіміра Навумава і Юрыя Сівакова**). Толькі гэтым можна патлумачыць бяздзейнасць як следчых органаў, так і адказных дзяржаўных асоб. Таму, калі глядзець на сітуацыю з юрыдычнага пункту гледжання, справы аб знікненнях палітыкаў раскрыты. Асобы, якіх падазраюць у здзяйсненні гэтых злачынстваў, устаноўлены. Калі б гэта было не так, то мы даўным-даўно атрымалі б абвяржэнне гэтай палітычна-матываванай версіі. Аднак улады, разумеючы, што вельмі моцны цяжар улік знойдзены грамадскасцю, не могуць нічога прыдумаць.Таму ў гэтай сітуацыі мы апасаемся, што ўлады знойдуць людзей, якіх прымусяць узяць віну па гэтых злачынствах на сябе альбо шлямах фальсіфікацыі ўлік, альбо абяцаннем не вельмі доўгага тэрміну зняволення. У нашай краіне гэта магчыма".

Жонка зніклага палітыка **Віктара Ганчара** Зінаіда Аляксандраўна таксама непакоіцца, што па справе аб знікненні яе мужа могуць быць асуджаны невінаватыя людзі: *"Мне паступалі тэлефанаванні аб тым, што ў некаторых РАУС з'явіліся фотаздымкі Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Таксам вядома, што быццам бы вядуцца апытанні людзей аб тым, ці бачылі яны чырвоны "БМВ", сляды якога былі знойдзены на месцы здарэння. Шыраз кажучы, імітацыя нейкіх актыўных дзеянняў выклікае смех. Прайшло дзесяць гадоў, многія людзі не помняць, што было ўчора, не гаворачы аб тым, што было дзесяць гадоў таму. Усе гэтыя рэчы насцярожваюць... Што тычыцца расследавання, то пасля з'яўлення рапарта Мікалая Лапацка людзі, чые прозвішчы там былі названы, павінны былі быць дапытаны. У свой час мы атрымалі пастанову следчага Чумачэнкі, які раней вёў справу аб знікненні Віктара Ганчара, аб тым, што некаторыя з іх, за выключэннем Шэймана і Лукашэнкі, быццам бы былі дапытаны. Аднак усе нашы просьбы і спробы азнаёміцца з нейкім прамежкавым вынікам расследавання ні да чаго не прывялі. Больш за тое, следчы Вараўка, які зараз вядзе гэтую справу, на кантакт з намі ўвогуле не ідзе. Выключэнне складаюць толькі нічога не вартыя адпіскі...*

Таму роўна за месяц да дзесятай гадавіны знікнення Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага мы разам з іншымі сваякамі зніклых вырашылі звярнуцца з лістом да Генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча, з тым каб даць яму магчымасць вельмі грунтоўна азнаёміцца з гэтымі справамі і ў любой даступнай для яго форме расказаць грамадскасці, што канкрэтна за дзесяць гадоў зроблена па гэтых справах... Таксама мы звярнуліся да дэпутатаў ПАСЕ, з тым каб яны запатрабавалі ад беларускіх калег разгледзець пытанне аб справах зніклых. Акрамя таго, мы звярнуліся да кіраўнікоў ЗША, Расіі, Францыі, Германіі, з тым каб яны запатрабавалі ад Лукашэнкі справаздачы, паколькі ён неаднаразова казаў, што справы зніклых знаходзяцца ў яго на асабістым кантролі..."

А вось маці зніклага аператара ГРТ **Дзмітрыя Завадскага** Вольга Рыгораўна больш за ўсё баіцца таго, што ў хуткім часе злачынствы будуць забыты. *"Што тычыцца справы аб знікненні майго сына, то апошні раз яна была прыпынена тры гады таму, —* нагадвае яна. *— Як вы ведаеце, людзі, якія былі асуджаны за выкрадзенне, але не забойства майго сына, асуджаны, але віны сваёй яны не прызналі. Следчых дзеянняў па справе Дзмітрыя зараз не вядзецца. Усе спробы дабіцца азнаямлення са следчымі пратаколамі бесплаўныя. Людзей асудзілі — улады супакоіліся. А вось вінаватыя яны ці не, судом, лічу, не даказана. Я з жахам думаю, што за даўнасцю часу ўсе гэтыя расследаванні папросту спыняцца, бо ўлады не зацікаўлены ў аб'ектыўным расследаванні спраў..."*

У сваю чаргу старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька** лічыць, што грамадства Беларусі не дарве злачынцам і не забудзе злачынствы ў дачыненні да апанентаў рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. *"Людзі ў Беларусі ніколі і нікому не дараюць палітычныя забойствы, —* лічыць ён. *— Троба разумець, што зараз ва ўзаемаадносінах афіцыйнага Мінска і міжнароднай супольнасці не засталося нязручных і некамфортных для ўлады пытанняў. Ёсць справа Аўтуховіча, але па ёй ідзе паленіка, ці палітычная гэта справа. Засталася толькі адна праблема, якую не можа прыбраць з парадку дня Брусель і якую не могуць абысці беларускія ўлады, — гэта арганізацыя знікненняў і магчымых забойстваў вядомых у Беларусі людзей. Час не знішчыць актуальнасць гэтай праблемы. У гэтай сувязі ў нас ёсць інфармацыя, што беларускія ўлады паспрабуюць знайсці "стрэлачнікаў", з тым каб павесіць на іх абвінавачанні ў знікненнях палітыкаў. Знойдуць, можа быць, і выканаўцаў. Ўладам трэба закрыць гэтае пытанне, і пажадана малой цаной. Гэтае пытанне будзе закрыта такім чынам, што на лаву падсудных не сядуць тыя, хто арганізоўваў злачынствы, хто аддаваў загады і распараджэнні... Справа ў тым, што да будучай прэзідэнцкай кампаніі Лукашэнка паспрабуе выйсці ўвесь у белым, з тым каб да яго было як мага менш прэтэнзій. У гэтай сувязі тэма зніклых будзе актуалізавана, у тым ліку і прадстаўнікамі ўлады..."*

Віталь ГАРБУЗАЙ.

Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь Васілевічу Р.А.

Паважаны Рыгор Аляксеевіч!

Дзесяць гадоў ведамства, якое Вы ўзначальваеце, вядзе расследаванне таго, што адбылося з нашымі мужамі і сынамі.

Увесь гэты час органы расследавання і пракуроры па наглядзе дзмансправалі сваю нядзольнасць эфектыўна расследаваць гэтыя злачынствы.

Бяздзейнасць улад, магчымая некампетэнтнасць следчых органаў працягваюць трымаць нас у невядомасці адносна лёсаў блізкіх нам людзей, што наносіць нам вялікія маральныя і фізічныя пакуты.

Тэрміны па справах шматразова працягваюцца без якіх-небудзь канкрэтных вынікаў. Справа ў дачыненні Дзмітрыя Завадскага прыпынена з 31.03.2006 года. Пастанова аб прыпыненні расследавання пацярпелым не ўручана, і мы пазбаўлены права на абскарджванне гэтага рашэння. Па іншых справах акрамя інфармацыі, што следства працягнута і аб выніках расследавання будзе паведамлена дадаткова, больш поўных і праўдзівых звестак не прадастаўляецца.

Улады яўна цягнуць час. У бліжэйшы час гэта прывядзе да таго, што справы будуць спынены ў сувязі з заканчэннем тэрміну даўнасці прыцягнення вінаватых да крымінальнай адказнасці.

Нядаўна кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю журналістам агучыў сваю версію прычын знікнення і былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі, і выконваючага абавязкі старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (парламента) 13-га склікання, старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў Віктара Ганчара, і бізнесмена Анатоля Красоўскага, і журналіста Дзмітрыя Завадскага.

Мы хочам ведаць: што са сказанага з'яўляецца праўдай?

Мы хочам ведаць, якія вынікі расследавання, якое цягнецца ўжо дзесяць гадоў, але так і не праліла святло на лёс зніклых у Беларусі людзей.

Мы настойваем і патрабуем азнаёміць нас з працэсуальнымі дакументамі, у якіх адлюстраваны вынікі расследавання спраў з прававымі ацэнкамі і высновамі, указанымі ў іх.

Мы патрабуем, каб цягам бліжэйшага месяца -- да 16 верасня - - Вы зраблі публічную справаздачу аб выніках расследавання. Вы можаце выбраць любую зручную для Вас форму (напрыклад, асабістую сустрэчу, інтэрв'ю недзяржаўным беларускім СМІ і гэтак далей), аднак хаваць ад нас праўду, прыкрываючыся разнастайнымі фармальнымі адгаворкамі і адпіскамі, недазваляльна.

Калі беларускія праваахоўныя органы не ў сілах расследаваць гэтыя злачынствы, мы гатовы дапамагчы ў прыцягненні да расследавання спецыялістаў з іншых краін.

Мы хочам, каб былі пакараны вінаватыя ў гэтых злачынствах.

Заклікаем Вас правяць грамадзянскую мужнасць і прафесійную смеласць і праліць святло на прычыны злачынстваў, якія мелі вялікі рэзананс не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Вольга Завадская,
Зінаіда Ганчар,
Ул'яна Захаранка.

16 жніўня 2009 года

КОРАТКА

Экспарт беларускіх тавараў скараціўся на 8 мільярдаў долараў

На 8,2 млрд долараў скараціўся за паўгода экспарт беларускіх тавараў. Пра гэта паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.

Таксама за першую палову 2009 года на 33,4%, альбо на 6,5 млрд долараў, скараціўся імпарт тавараў.

Як адзначае БелаПАН, істотнае скарачэнне вартасных аб'ёмаў знешнегандлёвых аперацый абумоўлена як зніжэннем сярэдніх коштаў на тавары, якія экспартуюцца і імпартуюцца, так і скарачэннем фізічных аб'ёмаў паставак.

Аляксандр Казулін: «Мне соромна выступаць дэкарацыяй спектакля»

Экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін заявіў, што не будзе браць удзел у прэзідэнцкіх выбарах у выпадку, калі ўлады не зменяць Выбарчы кодэкс.

"Я ніколі не прымаю ўдзелу ў тым, што не дае ніякага выніку. Мне соромна выступаць дэкарацыяй спектакля", — заявіў Аляксандр Казулін у інтэрв'ю Радыё Свабода.

Чавес неўзабаве наведае Беларусь

Выступаючы ў нядзельнай радыёпраграме "Алё, прэзідэнт", кіраўнік Венесуэлы Уга Чавес аб'явіў аб сваім намеры наведаць Беларусь, Расію і Лівію ў верасні.

Паводле слоў Чавеса, *"гэта падарожжа было запланавана на пачатак наступнага года, аднак апошнім часам з'явілася шмат прычын актывізаваць супрацоўніцтва з гэтымі трыма краінамі, якія з'яўляюцца стратэгічнымі партнёрамі Венесуэлы",* перадае агенцтва France Presse.

«Замест беларускіх дзяцей адпачываць у ЗША паехалі ўкраінскія»

Пра гэта ў размове з выданнем The press democrat заявіла кіраўнік чарнобыльскага праекта ў амерыканскім горадзе Пэталума (штат Каліфорнія) Рут Уільямс.

Паводле заявы Уільямс, яна ды іншыя прадстаўнікі праекта па-ранейшаму працягваюць рэгулярна атрымліваць электронную пошту ад беларускіх дзяцей, якія раней адпачывалі ў ЗША. Амерыканскія сем'і жадалі іх бачыць у сябе дома і сёлета. Аднак пасля мінулагодняга выпадку, калі 16-гадовая барысаўская школьніца Таня Казыра захацела застацца ў сям'і амерыканцаў Манузла і Добры Запатаў і не вярнулася дадому разам з іншымі дзецьмі, беларускія чыноўнікі адмовілі ў выездзе ў ЗША беларускім чарнобыльскім групам.

"І дарослыя, і дзеці былі сёлета літаральна спустошаныя ў выніку гэтай сітуацыі", — кажа Рут Уільямс.

Кліча мора

Прапанову латвійскага боку аб выкарыстанні Рыжскага порта разглядаюць у Мінску. Паводле слоў віцэ-мэра Рыжскай думы Айнарса Шлесерса, беларусам прапануюць выгадныя ўмовы для экспарту і імпарту прадукцыі праз Рыгу.

Акрамя таго, латвійскі бок не выключае продажу зямлёў на тэрыторыі порта пад будаўніцтва спецыялізаваных тэрміналаў.

Айнарс Шлесерс правёў перамовы з міністрам транспарту Беларусі Іванам Шчэрбам. Цікава, што ўдзел у перамовах прымаў кіраўнік фірмы, якая гандлюе зброяй, — кіраўнік "Белтэхэкспарту" Уладзімір Пефцёў.

Беларусы «ганяюцца» за доларам

Насельніцтва нашай краіны ў першым паўгодзі гэтага года купіла на 945 мільёнаў долараў больш, чым прадало.

Паводле звестак Нацбанка, летась назіралася адваротная тэндэнцыя — тады беларусы прадалі банкам амаль на паўмільярда долараў болей, чым купілі ў іх.

Зноў трагедыя ў Баранавічах

Галіна, якая абламалася і ўпала з дрэва, забіла дзвюх 57-гадовых жанчын у вёсцы Вольна ў Баранавіцкім раёне. Трагедыя адбылася на тэрыторыі прадпрыемства па вытворчасці канцэнтраваных сокаў.

Ад галіны таксама пацярпеў 54-гадовы мужчына, які шпіталізаваны з цяжкімі траўмамі.

Нагадаем, што на мінулым тыдні ў гэтым жа раёне дзвюх жанчын забіла сцяна склада, якая абрынулася ад непагадзі.

ДАСЛОЎНА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «Вы ў мяне спытайце, куды мы пайшлі: на Захад, на Усход...»

"Палітычная эліта Расіі абсалютна не ведае, што адбываецца ў Беларусі. Вось яны прачытаюць у гадкіх газетах, дзе заказных артыкулаў хапае, дзе многія ненавідзяць Беларусь, і гаворыць, што Беларусь пайшла на Захад, Дык вы ж разбярыцеся па афіцыйных каналах, вы ў мяне спытайце, куды мы пайшлі: на Захад, на Усход... Яны не ведаюць, што адбываецца тут... Чаму кіраўніцтва Расіі так страшна ўспрымае, што мы пачалі размову з Еўропай?.. Мы на 45 працэнтаў гандлюем з Еўропай — мільярды долараў. Я павінен гэта палітычна забяспечваць? Мы ж адмахнуцца ад гэтага не можам. Таму я забяспечваю ў знешняй палітыцы, дыпламатычна, свае эканамічныя інтарэсы."

(З інтэрв'ю тэлепраграме "Формула власти".)

ПАЛІТКУХНЯ

Статкевіч не адмовіўся ад ідэі стварэння партыі

Другая сесія ўстаноўчага з'езда Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) адбудзецца да канца 2009 года. Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні аргкамітэта па стварэнні партыі.

Як адзначае БелаПАН, пэўную дату ў партыі пакуль не прызначылі, бо могуць з'явіцца праблемы з арэндай памяшкання. Старшыня аргкамітэта Мікалай Статкевіч заявіў, што хутчэй за ўсё другая сесія адбудзецца ў лістападзе.

Палітык нагадаў, што першая сесія ўстаноўчага з'езда прайшла ў лістападзе 2007 года. На ёй было прынята рашэнне, што другая сесія павінна адбыцца на працягу двух гадоў. Гэты перыяд БСДП (Народная Грамада) законна існуе ў рангу аргкамітэта па стварэнні партыі, што дазваляе яе актывістам не трапляць пад дзеянне артыкула Крымінальнага кодэкса за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Зачем голодному человеку вместо хлеба подсовывать букет роз?

Борис ЖЕЛИБА, *профессор, доктор экономических наук*

Отныне по велению Нацбанка выдача валютных кредитов населению запрещена. Пока до 1 января 2011 года, но по замыслу — и далее, и навсегда. Это сделано, по словам главы Нацбанка, под флагом дедолларизации экономики Беларуси. По той же причине заблокированы кредитные валютные карточки физических лиц с неиспользованными остатками. Зарплатные карточки (дебетовые), предусматривающие выдачу валютного овердрафта, будут заменены. По задумке Нацбанка, население для внутренних расчетов не должно ориентироваться на мировые иностранные валюты, памятуя, что в государстве для этих целей имеется своя стабильная национальная валюта — белорусский рубль. Правда, с иностранным названием: рубль происходит от русского глагола "рубить".

Стабильность, устойчивость национальной денежной единицы — это прежде всего внутри страны — минимум инфляции, вне страны — неизменность ее обменных курсов по отношению к мировым (резервным) валютам: доллару США, евро, английскому фунту стерлингов и т.д. С долларизацией экономики денежные власти Беларуси уже сражались в середине и конце 90-х годов прошлого столетия. И не без основания. Тогда угроза доллара была действительно реальной. Он пугающе вытеснял слабый, высокоинфляционный "зайчик" из денежного оборота. Доллар мог вообще неожиданно быстро заместить в расчетах национальную валюту, как это случалось в отдельных государствах, переживавших финансовый кризис. С тех же времен у нас стало привычной покупка физическими лицами у физических лиц квартир, автомобилей, другого дорогостоящего имущества за доллары, позднее — за евро. Хотя по документам сделка оформлялась в рублях.

И в настоящее время, имея на руках доллары или евро, даже российские рубли, на наших рынках типа минских "Ждаников" или стадиона "Динамо" не пропадешь: приобретешь все, что надо, без обмена валют, напрямую. Между тем сделки такого рода давно запрещены законодательством. Продавец охотнее примет от вас валюту, нежели белорусские рубли, так как закупать товар ему придется за границей.

Нынешний белорусский рубль совсем другой, чем он был в 1990-х. Не без стараний Нацбанка и правительства он окреп, набрался сил. А чем сильнее, стабильнее валюта, тем меньше ей грозят всякого рода долларизации. В общем-то, пожелание Нацбанка, чтобы внутри страны платежи и расчеты населения осуществлялись только в национальной валюте, вполне логично и понятно. Иного в развитых государствах и не представишь. Тем не менее взглянем пристальнее на наш белорусский рубль и на то, что его обеспечивает в кризисное для страны время.

Рублевая инфляция оценивается в 13—14%, тогда как инфляция мировых валют — в 2—4%. Поэтому кредиты в белорусских рублях выдаются под 20 и более процентов, тогда как валютные кредиты — под 12—15%. 8 января текущего года белорусский рубль пережил разовую болезненную для населения девальвацию и обесценился к доллару на 20,5%. Нынче колебание обменного курса белорусского рубля к корзине валют — доллар, евро, российский рубль — предусмотрено до конца года в рамках расширенного коридора +/-10%. Хотя среди денежных единиц стран СНГ по темпам обесценения к доллару наш "зайчик" за первое полугодие вышел в лидеры. Как видим, должной стабильности нашего рубля, что служит основой доверия населения и субъектов хозяйствования к национальной валюте, пока не наблюдается. Но отметим, что определенные достижения в этом направлении в предкризисное время в результате усилий Нацбанка имеются.

Что же стоит за белорусским рублем в плане обеспечения, гарантии этой стабильности? На 1.07.09 г. золотовалютные резервы государства в национальном определении составили 3,1 млрд долларов США, по стандартам МВФ — 2,65 млрд, что крайне недостаточно. Этим даже не покроешь отрицательное сальдо торгового баланса Беларуси за полгода. С учетом ранее полученных внешних кредитов почти все резервы заимствованные. Нацбанк ожидает до конца года еще два транша на сумму 1,35 млрд долларов от МВФ и последний транш российского кредита в 0,5 млрд долларов, с тем чтобы довести резервы страны как минимум до 5,77 млрд долларов. Даже если это и удастся, то почти все они будут заимствованными, т.е. кредиты надо будет отдавать с процентами в ближайшие годы. Внешний государственный долг Беларуси за первое полугодие вырос на 45,4% — до 5,4 млрд долларов, валовой внешний долг — до 16,3 млрд долларов. Дефицит республиканского бюджета за январь—май составил 17 трлн белорусских рублей (6,1 млрд долларов). Как можно видеть, "тылы" белорусского рубля, мягко говоря, не ахти какие. Сюда следует добавить "подарки" кризиса в виде рекордных запасов готовой продукции (7,4 трлн рублей) и рекордного дефицита внешнеторгового баланса (3,95 млрд долларов за январь—июнь), который нужно закрывать внешними заимствованиями белорусских предприятий.

Взглянем поближе на наличный белорусский рубль, расчеты и платежи в котором выполняются в основном населением. Покупательная способность нашей национальной денежной единицы — никакая. Банкнота достоинством 1 рубль давно исчезла, выведена из денежного обращения. Обрененные кем-то банкноты номиналом 10, 20 рублей можно увидеть на тротуарах, к ним никто не проявляет интереса. Даже бомжи. Это у нас денежный мусор. Где уж тут до уважения к национальным деньгам! Однако кассирам магазинов, банков приходится пересчитывать все купюры. Напрашиваются очередная деноминация и введение в обращение монет. Кошельки граждан пухнут от бумажек, на которые мало что купишь... Наша наличная денежная система трудоемка в применении и громоздка. Давно созрела необходимость проведения денежной реформы, которую надо было делать до кризиса.

Сегодня денежные власти стремятся поднять статус белорусского рубля, что вполне показально. Вчера нам неоднократно заявлялось о готовности Нацбанка РБ и Центробанка РФ перейти в Беларуси на российский рубль. Как это расценивать? Конъюнктура изменилась? Думается, что главная причина запрета на валютные кредиты населению — это нарастающий дефицит валюты в стране, который продолжает усугубляться неутихающим финансово-экономическим кризисом. Много валюты заморожено в складских остатках продукции, не находящей сбыта за рубежом. И в плане мероприятий смягчения влияния кризиса решение Нацбанка вполне правильное. Валюта необходима в первую очередь для кредитования предприятий, для поддержания международных активов Нацбанка в их заработанной части, а не заемной, для обеспечения наличной валютой пунктов обмена.

На наш взгляд, об этом надо было просто так и сказать. И общественность отнеслась бы к этому с пониманием. Вместо этого глава Нацбанка рисует нам радужные перспективы, когда наш белорусский рубль будет (надо понимать, освободившись от долларовых пут) свободно конвертируемой валютой, и у нашего населения отпадет необходимость сильно беспокоиться за курсы иностранных валют. Задаешься вопросом: что это, очередная "маниловщина" или, хуже, когда голодному человеку вместо хлеба подсовывают букет роз?

Из любого учебника по финансам и кредиту можно узнать, что суть свободно конвертируемой валюты заключается в том, что ее, эту валюту, обменяют на местную, национальную в любом государстве либо примут в платежи. Таковыми валютами, помимо мировых — доллара США, евро, английского фунта стерлингов, японской йены и швейцарского франка, являются валюты высокоразвитых государств и нефтедобывающих стран типа Саудовской Аравии, Кувейта и т.п. На свободную конвертируемость на просторах СНГ может претендовать российский рубль, который подпирают более чем 400 млрд долларов резервов, запасы нефти и газа. Увы, к сожалению, никаких видов на свободную конвертируемость у белорусского рубля нет. И не предвидится ни в ближайшей, ни в дальней перспективе.

Это вовсе не значит, что наш рубль не надо укреплять, делать его стабильнее и сильнее. Более того, необходимо выкинуть все мысли о замене своей родной денежной единицы иностранной. Национальная валюта — это атрибут государственного суверенитета. Решать задачи по укреплению белорусского рубля следует адекватными сложившейся экономической ситуации мерами. Шаг за шагом, без громких заявлений-лозунгов. Сегодня — это думать о том, как удержать курс рубля, когда внешние заимствования иссякнут и придется отдавать долги кредиторам. А не мечтать о свободно конвертируемом рубле.

АДУСЮЛЬ

За паўгода ў 5 разоў паболела тых, хто працуе няпоўны рабочы дзень

Сёлета за паўгода колькасць працаўнікоў вытворчасці, якія працуюць няпоўны рабочы дзень або тыдзень, вырасла ў 5 разоў і склала кал 105 тыс. чалавек.

Колькасць працаўнікоў, якім былі прадстаўлены водпуск па ініцыятыве наймальніка, урасла ў 4,5 раза да 105,8 тыс. чалавек. Гэта афіцыйныя лічбы Белстата.

Міліцыя разбэсцілася

За сем месяцаў 2009 года ў сістэме МУС Беларусі зарэгістраваны 102 злачынствы. Гэта на 12% больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Такую статыстыку агучыў начальнік галоўнага ўпраўлення кадраў, статс-сакратар Анатоль Курылец.

За здзяйсненне злачынстваў асуджаны 53 супрацоўнікі міліцыі і вайскоўцы. За парушэнне законнасці пакаранымі 166 чалавек. За парушэнне дысцыпліны да адказнасці прыцягнутыя амаль 3 тыс. чалавек, найбольшая колькасць — у дэпартаменце аховы.

Напрыклад, крымінальная справа заведзена на намесніка начальніка Мазырскага РАУС. У 2007—2009 гадах, працуючы начальнікам у ДАІ, ён даваў незаконныя ўказанні кіраўнікам прадпрыемстваў-заказчыкаў перапіхць грошы на разліковыя рахункі камерцыйных структур за нібыта аказаныя платныя паслугі па суправаджэнні буйнагабарытных, цяжкавагавых і небяспечных грузаў пры перавозках.

За парушэнне службовай дысцыпліны звольнены начальнік Баранавіцкага аддзела дэпартамента аховы. З 2005 года ён прыцягваў падначаленых да прац, не звязаных з выкананнем службовых абавязкаў. А кіраўнік упраўлення дэпартамента выканання пакаранняў МУС па Магілёўскай вобласці даваў указанні залежным ад яго ў службе асобам па рамонце лазні і добраўпарадкаванні зямельнага ўчастка ў Бялыніцкім раёне.

Беларускія півазнаўцы выбралі новы гатунак піва

Беларускія півазнаўцы выбралі новы гатунак піва, які будзе вырабляцца на заводзе "Крыніца". Дэгустацыя адбылася ў пятніцу на тэрыторыі піўзавода ў Мінску. Выбар прайшоў у межах кампаніі "За нармальнае піва". Дванаццаць чалавек, якія перамаглі ў абласных конкурсах на лепшае выданне піва, прыбылі ў Мінск, каб вызначыць новы гатунак пеннага напою, які найбольш спадабаўся і які паступіць у продаж у верасні.

Півазнаўцы закрылі ў асобным пакоі. Прадстаўнікі СМІ і іншыя чужыя людзі ў дэгустацыйную залу не дапускаліся. Бутэлькі з трыма варыянтамі гатунку піва былі толькі пранумараваны. Ніякіх этыкетак на іх не было. Перамог варыянт № 2 — светлае нямоцнае піва з залацістым адценнем і слабым піўным пахам.

СИТУАЦИЯ

Узаконенный вандализм

Президент Всемирной ассоциации белорусских евреев (США) Яков Гутман просит Александра Лукашенко привлечь к ответственности руководство Мозырского райисполкома и чиновников правоохранительных органов, виновных в проведении работ на еврейском кладбище в Мозыре. Местные власти разворошили могилы и прокладывают через кладбище теплотрассу.

Фотографии, которые прилагаются к этому письму, свидетельствуют о том, что рабочие подняли из земли кости погибших.

Пракладка газаправода ў 2003 г.

"...После освобождения города от нацистов 14.01.1944 г. начала работать Чрезвычайная Государственная комиссия по расследованию преступлений немецко-фашистских захватчиков, — напоминает Яков Гутман. — В документах Комиссии записано: "На еврейском кладбище, находящемся в черте г.Мозыря, комиссия обнаружила 18 могил равных размеров. При поверхностном осмотре оказалось, что ни одна из могил не имела надмогильных холмов, памятников и других признаков, определяющих место погребения человеческих трупов. При вскрытии могил были обнаружены трупы стариков, женщин и детей. Число трупов в каждой могиле оказалось от 50 до 55 человек, что составляет на все могилы 960—1000 человек".

Свидетельница Татьяна Кошман рассказала 25 декабря 1944 г.: "Всех арестованных из СД вывозили и расстреливали где-то вру около д.Бобры. Но, опасаясь партизан, немцы осенью 1942 г. примерно с октября м-ца начали расстреливать советских граждан на еврейском кладбище против моего дома по Пушкинской улице. Лично я была очевидцем того, как в августе 1943 здесь же, на еврейском кладбище, немецкими извергами среди дня была расстреляна одна крестьянская семья, состоящая из старика, старухи, лет по тридцати пяти мужчины и женщины и двоих детей — мальчика лет 7 и девочки лет 9. Невозможно было смотреть, как эти дети шли вслед за дедушкой, за ними шла бабушка и молодые мужчина и женщина. Всех их с узелками положили в яму и расстреляли".

Кладбище имеет статус воинского захоронения, учетный номер паспорта 5754. Белорусский республиканский научно-методический совет дважды включал объект в Государственный список историко-культурных ценностей (далее — Список): 16.10.2001 г. (протокол №67) и 20.05.2003 г. (протокол №85).

При производстве земляных работ на еврейском кладбище нарушены законы Беларуси "Об охране историко-культурного наследия Республики Беларусь", "О погребении и похоронном деле", "Правила содержания мест погребения" (далее Правила). Ст.91 Правил гласит: "Использование закрытых кладбищ или частей их под застройку или для каких-либо других надобностей запрещается". Также нарушено Постановление Кабинета министров №85, утвержденное 9.02.1996 г. №85, "Об улучшении работы по увековечению памяти защитников Отечества и жертв войны". Пункт 18 постановления гласит: "Все виды работ, которые могут создавать угрозу для захоронения, запрещаются".

6 августа с.г. я обратился в прокуратуру и РОВД Мозырского района. При подаче заявления имела место беседа с заместителем прокурора Андреем Грибом и начальником РОВД Петром Зыкуном. Руководство райисполкома проинформировано о сложившейся ситуации. Работы не остановлены.

Я требую привлечения к уголовной и административной ответственности руководство Мозырского райисполкома, чиновников из правоохранительных органов. Они виновны в нарушении Законов Республики Беларусь, нарушили элементарные нормы цивилизованного общества, нанесли непоправимый вред международному авторитету государства. В 2003 г. по территории кладбища проложен газопровод. Вы были проинформированы об этом. Никаких мер принято не было.

Хотелось бы верить, что Вы лично решите вопрос достойного захоронения прилагаемых костных остатков. Возможно, эта часть черепа принадлежит тому мальчику и девочке, об убийстве которых нацистами рассказала Т.Кошман. Если этим костям нет места в земле, на которой они выросли, прошу выдать разрешение на их вывоз в США. Они будут достойно захоронены на кладбищенском участке в Нью-Йорке, принадлежащем Всемирной ассоциации белорусских евреев. Их покой уже никто и никогда не потревожит".

Слова міліцыянера

Начальніку крымінальнага вышуку Буда-Кашалёўскага РАУС удалося ўгаварыць ананімных злачынцаў вярнуць на месца выкрадзеныя з камбайна акумулятары.

Як паведамілі БелаПАН у аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гомельскага аблвыканкама, невядомыя ноччу выкралі з камбайна, які належыць КСУП "Рогінь", дзве акумулятарныя батарэі, з-за чаго камбайны не змаглі выйсці ў поле. Супрацоўнікі міліцыі на чале з начальнікам крымінальнага вышуку Іванам Шубчам, якія прыбылі на месца злачынства, адпрацавалі некалькі версій, але не змаглі ўстанавіць асобы злачынцаў і акалічнасці крадзяжу. І тады пайшлі па дамах, угаворваючы людзей вярнуць скрадзенае.

Наступным днём пасля гэтых размоў раніцай выкрадзеныя акумулятары стаялі каля варот мехдвара. Але пошук злодзеяў працягваецца.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

«Белзнешэканамбанк» удакладняе...

У нумары за 11.08.2009 г. мы надрукавалі заметку "Яшчэ адзін банк атрымаў рэйтынг "негатыўны", у якім ішла размова пра тое, што адзін з вядучых банкаў краіны атрымаў ад аўтарытэтнага агенцтва Fitch рэйтынг "негатыўны". Спецыялісты банка зрабілі некалькі важных удакладненняў да гэтага матэрыялу.

Па-першае, яны заўважаюць, што рэйтынг, які прысвоены вядомым агенцтвам Fitch, носіць комплексны характар, у ім утрымліваецца шэсць паказчыкаў. Сапраўды, па адным з гэтых паказчыкаў прысвоены так званы "негатыўны прагноз", але гэта звязана не з паказчыкамі і дынамікай развіцця банка, а ацэнвае ўнутраную і знешнюю фінансавую рызыку краіны ва ўмовах уплыву сусветнага фінансавэканамічнага крызісу на эканоміку і банкаўскую сістэму дзяржавы.

Па-другое, рэйтынгавая аднака Fitch — першая для "Белзнешэканамбанка", таму больш правільна было б казаць, што рэйтынг не "зніжаны", а "прысвоены". Больш за тое, комплексны рэйтынг, які прысвоены "Белзнешэканамбанку" агенцтвам Fitch, па сутнасці з'яўляецца адным з самых высокіх сярод беларускіх банкаў. Што ж датычыцца адзнакі "негатыўны прагноз", то, як заўважаюць спецыялісты, яе ў перыяд фінансавага крызісу маюць многія замежныя і большасць расійскіх банкаў.

Недакладнай палічылі ў банку і сцвярджэнне, што "эксперты Fitch лічаць, што беларускаму банку патрабуецца падтрымка ад расійскага ВЭБ". Так, у адпаведнай справаздачы агенцтва Fitch напісана наступнае: "Fitch прагназуе, што ў выпадку, калі "Белзнешэканамбанку" спатрэбіцца падтрымка, то яго галоўны акцыянер — расійскі "Внешэкономбанк" хутчэй за ўсё будзе мець жаданне і магчымасць яе прадаставіць".

ЕВРОСОЮЗ—БЕЛАРУСЬ

Об отмене визового режима для граждан ЕС

Совет министров Беларуси рассматривает предложение Министерства спорта и туризма об отмене визового режима для туристов из стран Евросоюза. Соответствующие ведомства гадают, выиграет или потеряет белорусская экономика, если бюджет лишится такой статьи доходов, как консульский сбор.

Примером может служить соседняя Украина, которая еще 1 мая 2005 года в односторонним порядке ввела безвизовый режим со странами ЕС. По данным Еврокомиссии, за четыре года количество туристов в Украину удвоилось и в 2008 году составило 9,2 млн человек. Если предположить, что каждый из них провел в Украине один день и потратил 100 долларов, то получается весомый вклад в экономику.

Другой пример представляет инициатива Израиля, отменившего в сентябре прошлого года визы для россиян. Уже в последнем квартале 2008 года оборот туристов вырос на 200 тысяч человек — именно столько россиян посетило Израиль за весь 2007 год.

Министр спорта и туризма **Олег Качан** в интервью "Белорусским новостям" отметил, что благодаря отмене визового режима и хорошей рекламе в Беларусь "хлынет поток туристов". "Наша страна тоже интересная", — считает он. В прошлом году Беларусь посетило 25.800 туристов из стран ЕС, каждый из них оставил около 200 долларов, благодаря чему бюджет пополнился более чем пятью миллионами долларов. Олег Качан подчеркнул своевременность предложения: в 2014 году страна принимает чемпионат мира по хоккею, и к соревнованиям планируется существенно улучшить всю туристическую инфраструктуру, в частности, гостиничный бизнес.

Уже в ближайшее время в столице стартует новый масштабный экскурсионный проект, планируются, в том числе, ежедневные экскурсии по Минску на английском языке, а также туры из столицы по регионам. В несрочной перспективе будут обустроены курортные территории, построены аквапарки, будет развиваться агротуризм. Обсуждается возможность внедрения системы такс-фри.

Впрочем, как считает директор турфирмы "Топ-Тур" **Михаил Селивон,** связь между въездной визой и количеством туристов сильно преувеличена. Так, визы не мешают европейцам ездить в Россию. По словам Михаила Селивона, основная масса туристов, приезжающих в Беларусь, — это бизнесмены, которые сотрудничают здесь с предприятиями, те, у кого есть родственники-белорусы, и транзитные туристы.

Массовый туризм в Беларуси развивать сложно, говорит эксперт. Существует не только набившая оскомину проблема низкого уровня сервиса (недостаточное количество гостиниц и транспорта, плохое обслуживание, отсутствие санитарной культуры), но и бюрократические препоны для открытия своего бизнеса. Так, например, место паломничества для религиозных туристов под Пинском не могут оформить уже фактически четыре года.

Со своей стороны, посол председательствующей в ЕС Швеции **Стефан Эрикссон** считает предложение об отмене визы для граждан стран Евросоюза очень разумным. В беседе с БелаПАН Стефан Эрикссон отметил, что европейский турист — подвижный, и необходимость в визе, про которую давно забыли в Европе, может психологически помешать визиту в Беларусь. А стране есть что предложить, говорит шведский дипломат, в том числе уникальную природу, пусть даже она не вызовет массового интереса туристов, скорее — определенных групп.

В комментарии БелаПАН представительство Еврокомиссии в Минске подчеркнуло ключевую роль туризма в развитии контактов между людьми, межкультурного диалога и взаимопонимания. Представительство приветствовало инициативу и выразило надежду, что Беларусь продолжит усилия по улучшению туристической инфраструктуры и более широкому распространению информации о стране, ее культуре, достопримечательностях.

Глава "Офиса за демократическую Беларусь" (Брюссель) **Ольга Стужинская** обратила внимание, что отмена виз для стран ЕС стала бы хорошим козырем в переговорах с Брюсселем об упрощении визового режима и снижении размера консульского сбора за шенгенские визы для белорусов.

Действительно, политически односторонняя отмена визового режима с ЕС принесет Беларуси неплохие дивиденды, показав в буквальном смысле открытость страны и готовность властей вести визовый диалог. Нельзя забывать о и "мягкой силе": увидев страну своими глазами, европейцы могут сформировать к ней более позитивное отношение.

С другой стороны, экономической выгоды, в частности, в первые годы, ожидать трудно. Беларуси сегодня фактически нет на туристической карте Европы, и потребуется время и широкая информационная кампания, чтобы доказать нашу уникальность.

Кроме того, серьезные усилия нужны и внутри страны: в Беларуси слабо развита туристическая инфраструктура. Этот недостаток может сослужить плохую службу, оставив негативное впечатление у первых потоков туристов, которые больше не вернутся сами и отговорят других.

Между тем, вопрос состоит и в том, какие цели ставят перед собой белорусские власти.

Если это пополнение бюджета, то для отмены визового режима достаточно рассчитать и доказать экономическую выгодность этого шага.

Если же Минск, как и Украина, рассчитывает, что в ответ визы отменит Брюссель, то, как показывает опыт Киева, эти надежды пока безосновательны. Возможно, что несколько ускорятся переговоры по всем базовым соглашениям. Упрощение визового режима для белорусов зависит от отношений с ЕС в целом, а они только начали осторожно развиваться.

Для достижения политических целей было бы целесообразно начать со снижения размера консульского сбора до 35 евро или упрощения визового режима, например, выдавать визы на границе. Тем более что это бы соответствовало той стратегии в отношениях с ЕС, которую выбрали белорусские власти: маленькими шажками, но вперед.

Марина РАХЛЕЙ.

Народная воля
http://www.nv-online.info
18—20 ЖНІЎНЯ 2009 г.

КАМПЕТЭНТНА

Леанід Злотнікаў: «У крызіс трэба ратаваць не прадпрыемствы, а людзей»

Незалежны эканаміст заяўляе, што ў Беларусі сітуацыя цяжэй, чым у іншых краінах.

На яго думку, адной толькі разгрузкай складоў улады Беларусі не вырашаць эканамічныя праблемы.

"Есць дзве рэчы, якія сапраўды дапамогуць выцягнуць краіну з крызісу: гэта свабодная прадпрымальніцтва і інавацыйнае развіццё", — заявіў Леанід Злотнікаў у інтэрв'ю Радыё TUT.BY.

"Калі ў Кітаі аб'ём продажаў знізіўся на 25%, у Нямеччыне — на 20—22%, дык наш экспарт скараціўся ўдвая. Асаблівасць нашай сітуацыі ў тым, што беларуская прамысловасць на працягу доўгіх гадоў станавілася ўсё менш канкурэнтаздольнай, эканоміка прымітывізавалася", — кажа эксперт.

"Паводле ацэнак міжнародных арганізацый нашая прамысловасць па канкурэнтаздольнасці знаходзіцца на 70-м месцы ў свеце. Беларускія прадпрыемствы, якія раней гучалі на ўвесь свет сваімі распрацоўкамі, зараз апусціліся да ўзроўню адвёрткавай зборкі, нягледзячы на ўсе ўкладзеныя ў іх грошы і даныя субсідыі", — патлумачыў эксперт.

Паводле яго слоў, нягледзячы на абвешчаную ўрадам лібералізацыю, у краіне па-ранейшаму існуюць нацэнкі і фіксаваныя кошты. *"Пры лібералізацыі наогул не павінна быць ніякіх нацэнак, дзяржава не павінна ўмешвацца ў фарміраванне коштаваў паліткі, яна павінна сачыць толькі за тым, каб была здаровая канкурэнцыя без манапалістаў"*, — сказаў Леанід Злотнікаў.

Леанід Злотнікаў заклікаў улады краіны спыніць падтрымку неэфектыўных прадпрыемстваў і рэарганізаваць АПК. *"Неабходна ратаваць не прадпрыемствы, а людзей... Трэба давесці дапамогу па беспрацоўі хаця б да 150—200 долараў — гэта магчыма, калі спыніць стратную працу, перавучыць людзей, даць ім магчымасць асвоіць іншую прафесію"*, — дадаў эксперт.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Перасцярога

Паведаміла "Комсомольская правда" в Белоруссии": падчас наведвання прэзідэнтам Ляхавіцкага раёна міліцыянеры забралі стрэльбы ў мясцовых паляўнічых. А ў тых, хто жыве побач са свінакомплексам, стрэльбы запламбіравалі ў сейфах...

Абшарыла ў райцэнтры пляц
Ахова прэзідэнта,
Каб, адкрываючы палац,
"Спокойно резал ленту".
А як са стрэльбы хто пульне
З суседняга балкона?
Не бачыць гэткага б і ў сне,
Бо паляцяць пагоны.
Таму збіралі ўсе "стволы"
У паляўнічых краю.
Цяпер (чакаюць пахвалы!)
Хай стужку разрэзае...
Убачыўшы такі расклад,
Падумаў губернатар:
"Есць і ў мяне праблем зашмат —
Зламыскігу багата.
А да народа ж я бліжэй,
